***(Шур В. В.***
***Онім у мастацкім тэксце : манаграфія. –***
***Мінск : Бел. кнігазбор, 2006. – 216 с.)***




У апошнія гады ў беларускай анамастыцы пачаў фарміравацца новы перспектыўны напрамак у вывучэнні літаратурных онімаў, асноўным аб’ектам якога з’яўляюцца асабовыя ўласныя імёны, прозвішчы, мянушкі, разнастайныя тапанімічныя назвы, ужытыя ў творах мастацкай літаратуры.

Неабходнасць даследавання такога напрамку абумоўлена і тым, што паэтонімы, іх кантэкстуальны патэнцыял займае своеасаблівае месца ў мастацкім творы: яны – выразны тэкстуальна маркіраваны сродак, які істотна ўплывае на асаблівасці стылю пісьменніка і дае магчымасць выявіць і прасачыць вытокі яго творчасці, станаўленне індывідуальнага метаду мастака. Такія адзінкі, з’яўляючыся кампанентам любога твора, у сваёй сукупнасці валодаюць разнастайнымі лексіка-стылістычнымі асаблівасцямі і тэкставымі канатацыямі, утвараючы своеасаблівую анамастычную прастору, якая ў сваю чаргу вызначаецца агульным кантэкстам, законамі жанру і мастацкага метаду пісьменніка, яго стылявымі індывідуальнымі асаблівасцямі, нацыянальнай спецыфікай і інш. Вывучэнне онімаў у тэкстах – гэта не толькі традыцыйная фіксацыя, класіфікацыя і апісанне анамастыкону як часткі агульнага слоўніка твора і вынік мэтанакіраванага пісьменніцкага адбору, ужывання ў тэксце, а і комплекснае ўзаемазвязанае даследаванне іншых кампанентаў літаратурнага тэксту.

Асэнсаванне функцый такіх адзінак у мастацкім творы часта прыходзіць праз шырокае разуменне і вытлумачэнне разнастайных лінгвістычных, літаратурна-эстэтычных з’яў і абагульненняў, абумоўленых найперш тэарэтычным узроўнем і сучасным станам усёй лінгвістыкі як навукі, аўтарскай канцэпцыяй, спецыфікай літаратурнага жанру, а таксама творчай манерай пісьменніка.

Падрыхтаваная В. В. Шурам манаграфія з'яўляецца новым словам у беларускім мовазнаўстве, а яе публікацыя своечасовая і актуальная, маючы на ўвазе змешчаныя ў ёй навукова-тэарэтычныя абагульненні і навучальныя магчымасці. Лічым, што апублікаванае манаграфічнае даследаванне В. В. Шура «Онім у мастацкім тэксце» будзе карысным ў вучэбна-выхаваўчым працэсе, а таксама патрэбным спецыялістам-філолагам, якія даследуюць творчасць пісьменнікаў.

*М. Р. Прыгодзіч,*
*доктар філалагічных навук, прафесар,*
*загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ,*

МГПУ им. И.П.Шамякина